


# Гродзенскі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 1 (262) • 1 лютага 1999 года, панядзелак

Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна


## Віншуем!

Першаму прарэктару Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, прафесару, доктару фізіка-матэматычных навук Івану Платонавічу Мартынаву за асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў адоранай моладзі спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і моладзі прысудзіў першую прэмію і спецыяльнае пасведчанне, якое было ўручана на Савеце універсітэта.

І.П. Мартынава горача павіншавалі рэктар універсітэта С.А. Маскевіч і калегі.

## Са святам!

Віншуем удзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і вайны ў Афганістане са святам - Днём абаронцаў Айчыны.

Моцнага Вам здароўя, шчасця, даўгалецця, плёну ў рабоце.

РЭКТАРАТ, ПРАФКАМ, САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ.

## 23 ФЕВРАЛЯ - ДЕНЬ ЗАЩИТНИКОВ ОТЕЧЕСТВА И ВООРУЖЕННЫХ СИЛ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# РАСТИТЬ ПАТРИОТОВ


**В.ВАНЬШИН,**
**старший преподаватель кафедры государственного, трудового и сельскохозяйственного права, участник Великой Отечественной войны**




23 февраля народ Республики Беларусь будет праздновать День защитников Отечества. Много военных испытаний пережил белорусский народ. Многими человеческими жизнями заплатило население республики в империалистической, гражданской, Отечественной войнах. Декретом Совнаркома была создана Рабоче-Крестьянская Красная армия, которая стала непобедимой, доказав свою боевую и моральную мощь тем, что, будучи плохо вооруженной и обученной, разгромила белую армию генералов Деникина, Юденича, Краснова, Врангеля, Колчака, а также оккупационные армии захватчиков Англии, Америки, Японии, Франции, Германии, со всех сторон пытавшихся восстановить реакционный режим царской России.

В Великую Отечественную войну 1941-1945 годов Советская Армия доказала свои преимущества: стойкость и героизм, проявленные в боях под Москвой, Сталинградом, в освобождении столиц городов Восточной Европы.

Я был призван в армию и направлен в Омское


*(Окончание на 3-й стр.).*


## ЦИТАТА НОМЕРА:

***« Время и случай ничего не могут сделать для тех, кто ничего не делает для себя самого».***

***Д. Каннинг.***

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.

29 студзеня - **Віктара Барысавіча ШПІРА** - выкладчыка кафедры фізвыхавання.

1 лютага - **Любоў Васільеўну СЕМАЧКІНУ** - дзяжурную інтэрната N 3.

3 лютага - **Святлану Ягораўну ЧАБУРАНАВУ** - дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

8 лютага - **Анатоля Фёдаравіча ЖУКА** - рабочага навучальнага корпуса N 3.

12 лютага - **Любоў Мікалаеўну КЕЧАНЬ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса N 4.

13 лютага - **Ірыну Уладзіміраўну СЕВЯРЫНАВУ** - бібліятэкара 1 катэгорыі.

15 лютага - **Галіну Мікалаеўну ДАЛЬКЕВІЧ** - кастэлянку інтэрната «Амега».

25 лютага - **Аляксандра Макаравіча КАЛАДЗІНСКАГА** - загадчыка кафедры агульнай фізікі.

25 лютага - **Дануту Іванаўну ВЕНСКОВІЧ** - старшага выкладчыка кафедры польскай філалогіі.

26 лютага - **Мікалая Аляксандравіча МЕЛЬНІКАВА** - дацэнта кафедры рускай і замежнай літаратуры.

27 лютага - **Вольгу Аркадзьеўну ЯРМАЛЮК** - старшага выкладчыка кафедры пачатковай школы.

*Афіцыйна*

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На першым у новым годзе пасяджэнні рэктарата былі падведзены вынікі атэстацыі, якая праводзілася ў мінулым годзе. З інфармацыяй выступілі старшыні атэстацыйных камісій: прарэктар па навучальнай рабоце Л.В.Рычкова і першы прарэктар І.П.Мартынаў.

- 221 чалавек уваходзіў у лік атэстуемых толькі ў гэтым навучальным годзе, - сказала Л.В.Рычкова. - Камісія працавала з вялікай нагрузкай. Але вынік відавочны. Выяўлены шэраг недахопаў у рабоце структурных падраздзяленняў. Некаторыя кіраўнікі падышлі да атэстацыі фармальна, няправільна афармілі дакументы. І гэта - таксама паказчык работы. Не праводзіліся ў некаторых падраздзяленнях тлумачэнні па атэстацыі. Таму некаторыя атэстуемыя прыходзілі непадрыхтаванымі, не разумелі або няправільна разумелі мэту гэтай работы.

Распрацаваны рэкамендацыі, накіраваныя на паляпшэнне работы ў структурных падраздзяленнях. Неабходна таксама распрацаваць адзіны крытэрый для распрацоўкі катэгорый.

- Атэстацыя не ставіла мэтай выявіць негатыў, - сказала Людміла Васільеўна, - але ў ходзе работы атэстацыйнай камісіі многія недапрацоўкі сталі відавочнымі.

Першы прарэктар І.П.Мартынаў паведаміў : атэстацыйная камісія пад яго кіраўніцтвам правяла пяць пасяджэнняў. Атэстацыі падлягалі 52 чалавекі. Атэставаны 50, 48 з іх адпавядаюць займаемай пасадзе. Два чалавекі рэкамендаваны для рэзерву, які зараз фарміруецца ў калектыве універсітэта.

# ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ І УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 60 ГАД

*ПОСТАЦІ ВНУ*

## ФІЛОСАФ ЧЭСЛАЎ КІРВЕЛЬ

**Віктар ТАРАНЦЕЙ, прафесар**



Чэслаў Станіслававіч Кірвель (нар. 9.03.1945 г.), на нашу думку, уваходзіць у тыя славутыя тры працэнты вучоных, якія здольны генерыраваць ідэі, праекты. Вакол такіх людзей у навуцы заўсёды акумулююцца іншыя таленавітыя навукоўцы, і гэта дае выдатныя вынікі ў навуковых даследаваннях.

... Дзяцінства і юнацтва былі нялёгкімі для ўраджэнца в. Мякішы Шчучынскага раёна. У сям'і Кірвеляў нарадзілася дзевяць дзяцей. Бацька Чэслава так перамерз у акопах у часы вайны, што бесперапынна хварэў і ў 1951 годзе памёр. Нястачы ў сям'і, спроба знайсці сябе самога ў жыцці, самому пабудаваць свой лёс прывялі да таго, што Ч.С. Кірвель пасля заканчэння дзевятага класа паехаў шукаць шчасця ў Калінінградскую вобласць. Працаваў рабочым, газазваршчыкам. Там жа атрымаў сярэднюю адукацыю ў школе рабочай моладзі (1964 г.).

Юнак займаўся самаадукацыяй, чытаў кнігі па гісторыі, філасофіі, сацыялогіі. У далейшым ён спрабуе паступіць на філасофскі факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Жданава. Сачыненне, на здзіўленне, піша на адзнаку «добра», а па гісторыі атрымлівае «пяць». Двух выкладчыкаў, якія прымалі экзамен па гісторыі, прыемна ўразілі веды маладога рабочага, які, аказваецца, добра ведае не толькі гісторыю сваёй краіны, але і гісторыю Манголіі (гэтае пытанне трэба было асвятліць пры адказе).

Перыяд вучобы працягваўся пасля трохгадовай службы ў арміі. Арміі ў той час не былі патрэбныя філосафы, таму ваенны будаўнік Ч.С. Кірвель добра азнаёміўся з прыёмамі працы з кельмай, ломам і рыдлёўкай.

Вярнуўшыся з войска, Ч.С. Кірвель з галавой акунаецца ў вучобу і навуку. Талент і працавітасць былі ацэнены па заслугах. Пасля заканчэння вну ён застаецца ў аспірантуры па мэтавым накіраванні палітэхнічнага інстытута г.Камсамольска-на-Амуры. Чатыры гады працуе ў названым палітэхнічным інстытуце старшым выкладчыкам. Але неймаверна хочацца на радзіму, да родных мясцін, да маці, да родных каранёў. З 1980 года лёс Ч.С. Кірвеля звязаны з Гродзенскім дзяржуніверсітэтам імя Янкі Купалы, дзе ён васемнаццаць гадоў узначальвае кафедру філасофіі. Менавіта тут ён фарміруецца як выдатны вучоны, таленавіты даследчык, арганізатар навукі.

Ч.С. Кірвель прыязджае ў Гродна кандыдатам навук (абараніў дысертацыю ў 1977 годзе). Але малады вучоны разумее, што дасягнуць пэўных поспехаў можна толькі распрацоўваючы канцэптуальную і грунтоўную філасофскую праблему. Плённа даследуе тэму, звязаную з сацыяльным утапізмам і яго роляй у жыцці грамадства. У 1983 годзе выходзіць яго першая манаграфія з аналагічнай назвай. Праз некалькі гадоў убачыла свет атрымаўшая высокія адзнакі манаграфія «Утапічная свядомасць: сутнасць, сацыяльна-палітычныя функцыі». У 1990 годзе ён абараніў доктарскую дысертацыю. У 1994 годзе выходзіць кніга «Вобразы будучыні: утопія і антыутопія ў сучасным свеце». Вучоны з'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння папулярнага сёння ў студэнтаў падручніка «Асновы філасофіі» (1994 г.). Два гады таму пад рэдакцыяй прафесара (з 1992 г.), доктара філасофскіх навук Ч.С. Кірвеля выходзіць першы ў Беларусі грунтоўны падручнік «Гісторыя філасофіі» (54 друкаваныя аркушы).

Ч.С. Кірвель чытае шмат лекцый для студэнтаў, аспірантаў, розных катэгорый насельніцтва. Яго лекцыі (як і павінна быць на занятках філосафа!) часта ператвараюцца ў дыскусіі па вострых праблемах жыцця, абуджаючы цікавасць у слухачоў да філасофскіх ведаў. Філосаф Ч.С. Кірвель як кіраўнік гарадскога і міжнароднага праблемнага семінара «Сучасныя праблемы філасофіі» аказвае сур'ёзны ўплыў на развіццё філасофскай навукі ў рэгіёне.

Цікавасць у палітыкаў, палітолагаў, наогул у кіраўнікоў дзяржаў СНД могуць выклікаць філасофска-публіцыстычныя эссэ Ч.С. Кірвеля па праблеме «Капіталізацыя ўсходнеславянскіх краін: утапічны выбар ці рэальная перспектыва?» Вучоны даказвае, што вытокі няўдач практычных спроб рыначнага рэфармавання ўсходнеславянскіх краін пабудаваны на першапачаткова памылковым тэарэтычным фундаменце без уліку папярэдняга развіцця эканомікі, асаблівасцяў прыродна-кліматычнага асяроддзя, тыпу рэлігіі, экалагічнага імператыву, нашых прыярытэтаў і ідэалаў. У выніку такіх пераўтварэнняў можа атрымацца тупік у канцы тунэля.

Сёння філосаф Ч.С. Кірвель знаходзіцца ў росквіце творчых сіл і задум.

*ФОТАРЭПАРТАЖ*

# СЕСІЯ - АСАБЛІВАЯ ПАРА



Спытайцеся ў любога студэнта, што найбольш цікавае ў яго жыцці, што самае-самае? І бадай кожны адказа: сесія. Так, сесія з яе трывогамі і бяссоннымі начамі, з турботамі і радасцямі - галоўны час «пік» жыцця. А можа, і само жыццё.



Мы задалі некалькі пытанняў студэнтам, якія чакалі перад запаветнымі дзвярыма сваёй чаргі на залік.

- Што для вас значыць сесія?

- Для мяне, напрыклад,



гэта — адказныя спаборніцтвы: хто каго.

- Як гэта разумець?

- Вельмі проста. Ці выкладчыкі - мяне, ці я - іх. Хто каго зваліць.

- І як атрымліваецца?

- З пераменным поспехам. Але часцей за ўсё - я выходжу з добрай адзнакай.

- А мне сесія падабаецца тым, што дапамагае выпрацоўваць адрэналін. А яшчэ - пазбавіцца расхлябанасці, сабрацца з думкамі. І прыемна адзначыць, што ты валодаеш нейкім багажом ведаў, можаш імі карыстацца. Вядома ж, не ўсё мы ведаем, не заўсёды працуем увесь семестр як трэба. А вось сесія - гэта асаблівая пара...

Так, сесія - асаблівая пара. Сёння яна ўжо за плячыма. У залікоўках - адзнакі. Апусцелі чытальныя залы і універсітэцкія калідоры. Але засталася яшчэ адна памятка аб студэнцкім жыцці, яшчэ адна сесія...

# РАСТИТЬ ПАТРИОТОВ

*(Окончание. Начало на 1-й стр.).*

пехотное училище имени Фрунзе, которое не окончил. Все курсанты были отправлены на Сталинградский фронт. Бои проходили в чистом поле. Участвовал в рукопашных схватках, под артиллерийским огнем и бомбежками, где наши войска несли крупные потери в личном составе. Наши солдаты и офицеры доказали всему миру стойкость Советских Вооруженных Сил и стали примером массового героизма.

24 ноября 1942 года под Сталинградом я был тяжело ранен и попал в госпиталь в г. Саратове, где находился до мая 1943 года. За активное участие в боевых действиях был награжден орденом I степени Отечественной войны, орденом Красной Звезды и медалью «За оборону Сталинграда».

После госпиталя я был освобожден от службы в армии как инвалид войны. Стал работать в органах внутренних дел. Вначале - в городе Саратове, затем - в городе Сумы на Украине. В 1948 году мать переехала в Минск, на свою родину. Я поступил в Минскую юридическую школу, затем - в Белорусский государственный университет имени В.И. Ленина на юридический факультет, который закончил в 1955 году. Работал в различных должностях в органах юстиции. С 1981 года - старший преподаватель кафедры государственного, трудового и сельскохозяйственного права. За время работы были опубликованы 6 монографий по теме «Социальное обеспечение колхозников в Республике Беларусь».

Обращаясь к молодежи призывного возраста, я советую не уклоняться от призывов, а принимать свою обязанность как долг перед Родиной. Служба в армии закаляет волю, воспитывает такие качества, как мужество, храбрость, которые помогают преодолеть любые сложные жизненные ситуации и трудности.

Ежегодно около 300 студентов нашего университета, получив дипломы, уходят служить в ряды Вооруженных Сил. Это имеет большое значение в формировании армии за счет молодежи с высшим образованием. Так, студенты юридического факультета А. Степаненко и И. Тарасевич добровольно пошли служить в ряды Вооруженных Сил республики.

В повседневной преподавательской работе уделяю внимание воспитанию молодежи в духе высоких принципов человеческой деятельности и гуманизма. Считаю, что главным в становлении личности мужчины являются физические и нравственные испытания во время прохождения военной службы. Воинское братство закладывает основы мужской дружбы, которая у многих остается на всю жизнь. Потому-то служба в армии необходима каждому молодому гражданину.

Пользуясь возможностью, поздравляю всех ветеранов, участников войны с Днем защитников Отечества и призываю их активно вести воспитательную работу среди учащейся молодежи, учить их стойкости и мужеству, дисциплинированности, готовности достойно нести военную службу в Республике Беларусь.

Праект

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (далей «Палажэнне») распрацавана ў мэтах матэрыяльнага заахвочвання работнікаў універсітэта ў якасным выкананні абавязкаў, у дасягненні колькасных і якасных паказчыкаў у працы.

1.2. Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам законаў аб працы Рэспублікі Беларусь, пастановамі Савета Міністраў, Міністэрства працы, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншымі нарматыўна-прававымі актамі, якія рэгулююць пытанні матэрыяльнага стымулявання працы работнікаў.

1.3. Палажэнне распаўсюджваецца на супрацоўнікаў і сумяшчальнікаў універсітэта (далей - супрацоўнікі), якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту (акрамя работнікаў навукова-даследчага сектара універсітэта), а таксама супрацоўнікаў, якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў пазабюджэтных крыніц фінансавання.

1.4. Палажэнне з'яўляецца неад'емнай часткай калектыўнага дагавору універсітэта. Палажэнне зацвярджаецца рэктарам універсітэта пасля адабрэння яго канферэнцыяй працоўнага калектыву.

Змяненні і дапаўненні ў дадзенае Палажэнне могуць быць унесены толькі пасля адабрэння іх канферэнцыяй працоўнага калектыву.

**2. Парадак фарміравання і асноўныя напрамкі выкарыстання фонда матэрыяльнага стымулявання**

2.1. Фонд матэрыяльнага стымулявання фарміруецца за кошт:

- дзяржбюджэтных сродкаў (20% ад планавага фонду аплаты працы);
- сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці.

2.2. Фонд матэрыяльнага стымулявання складаецца з фонду надбавак і прэміяльнага фонду ў розных суадносінах.

2.3. Эканомія фонду заработнай платы структурнага падраздзялення размярковуваецца паміж супрацоўнікамі кіраўніком структурнага падраздзялення або ў адпаведнасці з распрацаваным структурным падраздзяленнем палажэннем, зацверджаным рэктарам.

**3. Парадак і ўмовы ўстанаўлення надбавак**

3.1. Для ўстанаўлення надбавак супрацоўнікам універсітэта распрацоўваецца шкала надбавак (базавыя каэфіцыенты надбавак).

3.2. На падставе базавых каэфіцыентаў вызначаюцца індывідуальныя каэфіцыенты і памеры надбавак.

3.3. Мінімальны базавы каэфіцыент надбавак - 0,2.

3.4. Максімальны базавы каэфіцыент надбавак - 0,8.

3.5. Супрацоўнікам універсітэта ў залежнасці ад займаемай пасады, аб'ёму службовых абавязкаў і якасці працы ўстанаўліваюцца наступныя базавыя каэфіцыенты надбавак:

- вучэбна-дапаможнаму і тэхнічнаму персаналу, супрацоўнікам аддзелаў універсітэта, супрацоўнікам бібліятэкі - 0,2;
- асістэнтам, выкладчыкам, старшым выкладчыкам, загадчыкам аддзелаў - 0,3;
- дацэнтам, кіраўнікам планава-эканамічнага, навучальнага, навучальна-метадычнага аддзелаў, штатным намеснікам дэканаў, дырэктару бібліятэкі - 0,4;
- прафесарам, дэканам - 0,5;
- прарэктарам, галоўнаму бухгалтару - 0,6.

3.6. Загадчыкам кафедр устанаўліваецца дадатковая надбаўка ў памеры — 0,2, няштатным намеснікам дэкана — у памеры — 0,25.

3.7. У мэтах стымулявання найбольш прыярытэтных напрамкаў развіцця універсітэта з фонду надбавак у распараджэнне рэктара выдзяляецца 30%.

3.8. Фонд надбавак рэктара выкарыстоўваецца па яго меркаванню.

Індывідуальны каэфіцыент надбавак супрацоўнікаў універсітэта, устаноўлены з фонду надбавак рэктара, не можа перавышаць 0,1.

3.9. Індывідуальныя каэфіцыенты супрацоўнікам універсітэта ўстанаўліваюцца загадам рэктара на падставе падання кіраўніка структурнага падраздзялення або рашэння камісіі па матэрыяльным стымуляванні структурнага падраздзялення ў межах сумы каэфіцыентаў структурнага падраздзялення. Індывідуальныя каэфіцыенты не могуць перавышаць максімальны базавы каэфіцыент.

3.10. Склад камісіі па матэрыяльным стымуляванні структурнага падраздзялення вызначаецца кожным структурным падраздзяленнем і зацвярджаецца кіраўніком структурнага падраздзялення. Камісія пры ўстанаўленні індывідуальных каэфіцыентаў супрацоўнікам павінна ўлічваць якаснае выкананне абавязкаў, выкладчыцкую, навукова-даследчую работу, творчыя дасягненні ў працы, іншыя паказчыкі, якія могуць быць распрацаваны структурным падраздзяленнем.

3.11. Асобным катэгорыям супрацоўнікаў рэктар мае права ўстанавіць персанальныя надбаўкі, якія не павінны перавышаць 50% службовага аклада.

3.12. Памер індывідуальнага каэфіцыента можа быць павялічаны або паменшаны на 0,1 ад базавага каэфіцыента, пры гэтым павінна быць захавана агульная сума базавых каэфіцыентаў структурнага падраздзялення і агульны аб'ём базавых каэфіцыентаў па кожнай катэгорыі работнікаў.

3.13. Пры ўстанаўленні супрацоўнікам індывідуальных каэфіцыентаў могуць быць улічаны наступныя паказчыкі:

3.13.1. дзелавыя якасці супрацоўніка:

- кампетэнтнасць (веды ў галіне спецыяльных пытанняў і сумежных праблем, перадавога вопыту работы; здольнасць асвойваць новыя метады працы, вырашаць новыя праблемы, бачыць перспектыву і вынікі рашэнняў, якія прымаюцца, выконваць даручэнні без непасрэднай дапамогі кіраўніка, выконваць абавязкі адсутнічаючых калег і г.д.);
- адносіны да працы (адказнасць, праяўленне самастойнасці і ініцыятывы, мэтанакіраванасць да паляпшэння метадаў працы і яе вынікаў; гатоўнасць прымаць на сябе, у выпадку неабходнасці, дадатковыя абавязкі; працаздольнасць; здольнасць пры неабходнасці ў кароткі тэрмін выканаць вялікі аб'ём працы; вытворчая і выканаўчая дысцыпліна і г.д.);
- арганізатарскія здольнасці (для кіраўнікоў падраздзяленняў);

3.13.2. складанасць працы:

- характар работ (змест і характар працоўнай дзейнасці; складанасць інфармацыі, тыпаў задач, якія патрэбна вырашаць: ступень навізны і наяўнасць элементаў творчасці і г.д.);
- разнастайнасць (комплекснасць) работ (шырокія

разнавіднасці складу і зместу работ; складанасць работы ад пастаяннай навізны; выкананне розных функцый у рамках працоўнай дзейнасці, якія патрабуюць спецыяльных ведаў у суменжных галінах і г.д.);

- самастойнасць выканання работ;

- дадатковая адказнасць (работа, звязаная з прыёмам, захаваннем і выдачай фінансавых і матэрыяльных каштоўнасцей; работа з дакументамі строгай справаздачнасці; работа, звязаная з прыняццем рашэнняў, якія могуць значна ўплываць на дзейнасць універсітэта ў цэлым і яго структурных падраздзяленняў і г.д.);

- выкананне асабліва тэрміновай работы, якая не прадугледжана непасрэдна службовымі абавязкамі супрацоўніка;

- выкананне работ, якія вынікаюць са стратэгічных задач універсітэта.

3.14. Надбаўкі супрацоўнікам могуць быць адменены або зменшаны ў выпадку:

- парушэння працоўнай і вытворчай дысцыпліны;

- невыканання тэрмінаў завяршэння работ;

- зніжэння якасці даручанай работы;

- адсутнасці сродкаў на выплату надбавак.

**4. Парадак прэміравання супрацоўнікаў універсітэта**

4.1. Прэміраванне з'яўляецца матэрыяльным заахвочваннем супрацоўнікаў за дасягненне колькасных і якасных паказчыкаў у рабоце, якія залежаць ад працоўных намаганняў асобных супрацоўнікаў або калектыву супрацоўнікаў.

4.2. Прэміраванне супрацоўнікаў можа праводзіцца за:

- высокую якасць, эфектыўнасць, аператыўнасць выканання работ, службовых абавязкаў;

- выкананне датэрмінова і з неабходнай якасцю заданняў і даручэнняў;

- эканомію матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў;

- рацыяналізатарскія прапановы і вынаходніцтвы;

- актыўнае садзейнічанне ўкараненню ў практыку новых прагрэсіўных форм арганізацыі працы, адукацыйных тэхналогій, форм, метадаў навучання;

- працу па навукова-метадычным забеспячэнні навучальнага працэсу, распрацоўку навучальных і метадычных дапаможнікаў;

- каардынацыю работы па творчым супрацоўніцтве з іншымі навучальнымі ўстановамі, у тым ліку замежнымі, навукова-даследчымі і праектна-канструктарскімі інстытутамі, прадпрыемствамі рэспублікі;

- выкананне асабліва тэрміновай работы, якая не прадугледжана непасрэдна службовымі абавязкамі супрацоўніка;

- удзел у камп'ютарызацыі, укараненне новай тэхнікі ў навучальны працэс;

- прысуджэнне ганаровых званняў, узнагароджанне Ганаровай граматай;

- абарона дысертацыі;

- выданне падручніка, навучальнага дапаможніка і інш.;

- у сувязі з выхадам на пенсію.

4.3. Прэміраванне можа праводзіцца па выніках працы за месяц, квартал, год пры наяўнасці адпаведных сродкаў фінансавання.

Памер прэміі кожнага супрацоўніка, прадстаўленага да прэміравання, вызначаецца ў межах выдзеленай сумы прэміяльных сродкаў (на структурнае падраздзяленне, работу, заданне) дыферэнцавана з улікам асабістага ўкладу ў агульныя вынікі працы.

Памер прэміі супрацоўнікам універсітэта з улікам аб'ёмаў і якасці выконваемых работ максімальнымі памерамі не абмяжоўваецца.

4.4. Прэміяльны фонд універсітэта складаецца з прэміяльнага фонду структурных падраздзяленняў (60%) і прэміяльнага фонду рэктара (40%).

4.5. Прэміяльны фонд структурных падраздзяленняў выкарыстоўваецца наступным чынам:

4.5.1. 30% - для прэміравання структурных падраздзяленняў.

Разлік і размеркаванне прэмій праводзіцца планава-эканамічным аддзелам прапарцыянальна даходам, якія атрыманы ў выніку пазабюджэтнай дзейнасці структурнага падраздзялення;

4.5.2. 30% - для прэміравання супрацоўнікаў структурных падраздзяленняў.

Разлік і размеркаванне прэмій праводзіцца планава-эканамічным аддзелам прапарцыянальна службовым акладам супрацоўнікаў і даводзіцца да кіраўнікоў структурных падраздзяленняў.

4.6. Прэміяльны фонд рэктара выкарыстоўваецца па свайму меркаванню.

4.7. Кожнаму супрацоўніку прэмія выплачваецца за фактычна адпрацаваны перыяд.

4.8. Планава-эканамічны аддзел праводзіць разлік сродкаў для прэміравання па выніках работы за папярэдні месяц і даводзіць да ведама рэктара універсітэта, а ў неабходных выпадках інфармуе кіраўнікоў структурных падраздзяленняў.

4.9. Прадстаўленне супрацоўнікаў да прэміравання праводзіцца кіраўнікамі структурных падраздзяленняў, дэканамі факультэтаў па ўзгадненні з прафсаюзнымі бюро структурных падраздзяленняў.

4.10. Прадстаўленне да прэміравання кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, дэканаў факультэтаў праводзіцца прарэктарам, які курыруе работу дадзенага структурнага падраздзялення. Прадстаўленне да прэміравання прарэктараў праводзіцца рэктарам па ўзгадненні з прафсаюзным камітэтам універсітэта.

4.11. Падставай для ўстанаўлення прэміі кожнаму супрацоўніку з'яўляецца паданне кіраўніка структурнага падраздзялення.

4.12. Структурныя падраздзяленні маюць права для размеркавання прэмій супрацоўнікам распрацаваць унутраныя палажэнні, якія не супярэчаць дадзенаму.

Распрацаванае структурным падраздзяленнем палажэнне ўступае ў сілу пасля абмеркавання яго на Савеце факультэта і зацвярджэння дэканам факультэта, а палажэнне, распрацаванае іншым структурным падраздзяленнем, уступае ў сілу пасля зацвярджэння яго прарэктарам, які курыруе работу дадзенага падраздзялення.

4.13. Выплата прэмій ажыццяўляецца на падставе загаду рэктара універсітэта, які ўзгоднены з прафсаюзным камітэтам.

4.14. Прэмія не налічваецца на перыяды;

- часовай непрацаздольнасці;

- адпачынкаў без захавання заработнай платы;

- адпачынкаў па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту, які вызначаецца адпаведнымі заканадаўчымі актамі;

- чарговых адпачынкаў;

- павышэння кваліфікацыі;

- іншыя перыяды адсутнасці работніка на месцы працы,калі за работнікам у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам захоўваецца сярэдняя заработная плата.

4.15. Супрацоўнікі могуць быць пазбаўлены прэміі часткова або поўнасцю за:

- недобрасумленнае выкананне функцыянальных абавязкаў, якое пацвярджаецца вынікамі праверак;

- парушэнне правілаў унутранага працоўнага распарадку, Статута;

- парушэнне правілаў аховы працы і тэхнікі бяспекі;

- невыкананне ў тэрмін абавязкаў па калектыўнаму дагавору;

- наяўнасць дысцыплінарнага спагнання.

4.16. Памяншэнне памера або пазбаўленне прэміі афармляецца загадам рэктара з абавязковым указаннем прычын.

**Праект уносіцца адміністрацыяй па ўзгадненні з камісіяй прафкама па заработнай плаце.**

# НА СМОТРЕ – ГРАЦИИ





В соревнованиях по спортивной гимнастике в программе спартакиады университета принимали участие сборные команды факультетов, составленные из девушек-гимнасток 1-ых курсов. В команде было десять спортсменов, в зачет шли девять лучших результатов на командном снаряде. Торжественно прошел ритуал открытия соревнований. Участников приветствовали первый проректор университета профессор И.Мартынов, декан факультета физической культуры, доцент В.Корчевский, зав. кафедрой физвоспитания, доцент С. Городилин и председатель спортклуба А.Емельяненко.

Основная борьба за переходящий приз развернулась между командами факультета экономики и управления и будущими юристами. С первого снаряда лидерство захватили будущие управленцы и не упустили его до финиша.

Вот кто привел команду к победе: Екатерина Клепчукова, Ольга Конон, Елена Ващенко, Ирина Есенкова, Анна Зайко, Ольга Смидина, Анна Шах, Мария Миклаш, Ольга Филипович, Марина Манкевич (зам. декана по физкультурно-массовой работе Т. Малышко), второе место у будущих юристов (зам.декана А. Кудель), третье - у будущих психологов (зам.декана В. Мышкевич). Кроме призов команды получили от спортклуба грамоты.

Далее места распределились в следующем порядке: физико-технический, биологический, филологический, математический, факультет истории и культуры.

Абсолютной чемпионкой стала студентка факультета биологии Алена Герус. 46,4 балла - ее победная сумма в многоборье. Второе место заняла Ольга Шатерник (юридический - 45,8 балла), на третьем - Татьяна Мисаревич (филологический факультет - 45,5 балла).

Победителями в отдельных видах стали: Ирина Есенкова (вольные упражнения), Татьяна Мисаревич (опорный прыжок), Юлия Бельская (упражнения на бревне), Елена Герус (упражнения на брусьях и акробатика).

Победители и призеры награждены грамотами и памятными призами.





**О. СМОЛЯКОВ,**
**главный судья соревнований, судья Высшей национальной категории.**

# РАВНЕНИЕ – НА ЧЕМПИОНОВ

На пороге уходящего 1998 года состоялся спортивный праздник, посвященный 20-летию образования университета.

Наши студенты, совмещая учебные занятия со спортом, добиваются высоких спортивных результатов по многим видам спорта. Вот и на спортивном вечере присутствовали наши студенты и выпускники, чемпионы, призеры и участники олимпийских игр, заслуженные мастера спорта, мастера спорта международного класса: Александр Курлович, Ирина Шилова, Константин Лукашик, Анатолий Федоренко, Олег Гоголь, Александр Савко.

В настоящее время по 30 видам спорта в стенах университета занимаются два заслуженных мастера спорта, мастер спорта международного класса, шестьдесят мастеров спорта, более двухсот кандидатов в мастера спорта и перворазрядников. С особой симпатией и уважением мы относимся к тем, кто завоевал право считаться сильнейшим. В спортивных залах, на голубых дорожках бассейнов, стадионах, борцов-

*(Окончание на 8-й стр.).*

### Віншуем!

За актыўны ўдзел у рабоце прафсаюзнай студэнцкай арганізацыі і паспяховую вучобу студэнту 5 курса фізіка-тэхнічнага факультэта, кіраўніку секцыі КВЗ універсітэта Юрыю Сегіневічу прысвоена стыпендыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

## КАРОТКІМ РАДКОМ

На базе юрыдычнага факультэта праводзіўся конкурс інтэлектуальных гульняў. Удзельнічалі тры каманды: юрыдычнага факультэта нашага універсітэта, недзяржаўных - інстытута правазнаўства і беларускага універсітэта кіравання. Прыемна адзначыць, што за нашай камандай - першае месца.

На факультэце педагогікі і псіхалогіі праводзіўся дзень адкрытых дзвярэй. Каля ста чалавек прыйшлі ў гэты дзень на сустрэчу з выкладчыкамі і студэнтамі факультэта. Шмат самых розных пытанняў задавалі госці і атрымлівалі на іх вычарпальныя адказы.

Студэнцкая каманда матэматычнага факультэта нашага універсітэта прымала ўдзел у Алімпіядзе ў Расіі. На жаль, поспех не спадарожнічаў нашым праграмістам. Змяніўся ўзровень складанасці, далёка ўперад пайшлі інфармацыйныя тэхналогіі. Але любы вынік - гэта вынік.

# СЕМИНАР ПРОДОЛЖАЕТ РАБОТУ

**Л.ПУТЯТО,**
**преподаватель кафедры возрастной и педагогической психологии**

Начал свою работу в 1998/99 учебном году на отделении психологии научно-психологический семинар «Актуальные проблемы современной психологии». Руководитель - старший преподаватель кафедры возрастной и педагогической психологии Ковалевский П.А.

На первом заседании, которое состоялось 19 ноября, с докладом «Актуальные проблемы развития психологической службы» выступила В.С. Богословская, старший преподаватель кафедры возрастной и педагогической психологии.

В 1998/99 учебном году запланированы следующие выступления:

**Декабрь 1998 года.** Янчий А.И. (преподаватель кафедры возрастной и педагогической психологии). Психологические особенности понимания трудными подростками личности значимого другого как субъекта общения.

**Февраль 1999 года.** Профатило Е.В. (аспирантка 2 курса отделения психологии). Когнитивная сложность как дифференцированность социальной перцепции педагогов.

**Март 1999 года.** Филончук Л.О. (аспирантка 2 курса отделения психологии). Результаты диагностики способности к прогнозированию педагогических явлений на разных этапах педагогической деятельности.

**Апрель 1999 года.** Колышко А.М. (преподаватель кафедры общей и социальной психологии). Коррекция самоотношения педагогов как необходимое условие изменения его взаимодействия с учеником.

**Май 1999 года.** Ковалевский П.А. (старший преподаватель кафедры возрастной и педагогической психологии). Проблемы политической психологии.

**Июнь 1999 года.** Наумкина Ю.Б. (аспирантка 1 курса отделения психологии). Проблема самосовершенствования в педагогической деятельности.

В прошедшем учебном году состоялось заседание научно-психологического семинара, на котором были заслушаны и обсуждены следующие доклады и сообщения:

**Октябрь 1997.** Кондратьева С.В. (профессор, заведующая кафедрой психологии). Принцип системности в психологии.

**Ноябрь 1997.** Янчий А.И. (аспирантка 3 курса отделения психологии). Особенности понимания трудными подростками значимых других. Профатило Е.В. (аспирантка 2 курса отделения психологии). Диагностические возможности методики «личностных конструктов» (Дж.Келли).

**Декабрь 1997.** Филончук Л.О. (аспирантка 1 курса отделения психологии). Формирование прогностических способностей учителя. Прокофьева Н.И. (студентка 5 курса отделения психологии). Особенности стилей общения учителей начальных классов с учащимися.

**Февраль 1998.** Колышко А.М. (преподаватель кафедры психологии). Система саморегуляции личности. Гончарова И.В. (студентка 5 курса отделения психологии). Рефлексия трудностей в работе школьного психолога.

**Март 1998.** Вербова К.В. (доцент кафедры психологии). Мотивация педагогической деятельности. Муринова Н.Н. (преподаватель кафедры психологии). Психологические особенности детей из неполных семей.

**Апрель 1998.** Путято Л.М. (преподаватель кафедры психологии). Особенности общения учителей с учащимися на уроке. Данильчик Ю.Н. (студентка 5 курса отделения психологии). Динамика ценностных ориентаций у будущих учителей.

**Май 1998.** Карпинский К.В. (студент 3 курса отделения психологии). Проблема жизненного пути в трудах Б.Г. Ананьева.

В 1998/99 учебном году семинар продолжает работу. Заседания проводятся каждую четвертую среду. Приглашаем педагогов, психологов, всех, кто интересуется теоретическими и прикладными аспектами психологии.

**Контактный телефон 39-98-10 (отделение психологии Гродненского государственного университета имени Янки Купалы).**

СОВЕТЫ ПСИХОЛОГА

## КАК ОБРЕСТИ УВЕРЕННОСТЬ В СЕБЕ?

1. Признайтесь себе в своих сильных и слабых сторонах и соответственно сформулируйте свои цели.
2. Решите, что для вас ценно, во что верите, какой хотели бы видеть свою жизнь.
3. Докопайтесь до корней. Постарайтесь простить тех, кто... Простите себе прошлые ошибки. Освободите место для воспоминаний о былых успехах, удачах, пусть и небольших.
4. Не позволяйте предаваться чувству вины и стыда, они не помогут достичь успеха.
5. Ищите объяснение причин в аспектах нынешней ситуации, а не в недостатках собственной личности.
6. Не забывайте, что каждое событие можно оценить по-разному.
7. Никогда не говорите о себе плохо.
8. Воспользуйтесь конструктивной критикой.
9. Помните: иное поражение - это удача!
10. Не миритесь с теми, кто заставляет вас чувствовать свою неполноценность.
11. Позволяйте себе расслабляться, прислушиваться к себе.
12. Практикуйтесь в общении.
13. Знайте: наше «Я» гнется, но не ломается.
14. Определите цели, близкие и дальние, выберите средства. Не оставляйте без внимания каждый свой успешный план... Не забывайте поддерживать и похваливать себя.
15. Вы - неповторимая личность, активный творец своей жизни, вы повелеваете событиями.

# РАВНЕНИЕ – НА ЧЕМПИОНОВ

(Начало на 6-й стр.).

ских коврах, определены 10 лучших спортсменов университета 1998 года. Ими стали студенты факультета физической культуры Анатолий Федоренко и Борис Радкевич - греко-римская борьба, Константин Семенов - дзюдо, Александр Булава и Александр Гончаров - плавание, Светлана Судак и Игорь Кравцов - легкая атлетика, Юрий Черняк - баскетбол, Дмитрий Фарейторов - настольный теннис и Андрей Обуховский - волейбол.

На протяжении года стабильно выступала сборная команда университета по греко-римской борьбе и по праву стала обладателем Кубка Европы 1998 года, который был вручен на спортивном вечере. По 15 видам спорта сборные команды университета приняли участие в Спартакиаде вузов Республики Беларусь и в общекомандном зачете. Гродненский государственный университет имени Янки Купалы занял III место, уступив Академии Спорта и Гомельскому университету.

В течение года шла спортивная борьба между командами вузов г. Гродно в программе Спартакиады. Наш университет принял участие двумя сборными командами. Итоги соревнований подвел начальник управления по физической культуре, спорту и туризму Гродненского горисполкома Владимир Николаевич Чигиринов и вручил переходящие кубки Спартакиады: за первое место - факультету физической культуры (декан В.М. Карчевский) за второе место награждена команда университета-2 (зав. кафедрой физвоспитания С.К.Городилин).

Стало доброй традицией в канун уходящего года, когда подведены итоги Спартакиады университета по 13 видам спорта среди факультетов, награждать победителя и призеров. Ректор университета профессор Сергей Александрович Маскевич в торжественной обстановке вручил переходящий кубок и диплом I степени команде юридического факультета (декан Иосиф Иванович Веленто, зам. декана по физвоспитанию Александр Александрович Кудель). Диплом II степени и кубок достался команде факультета экономики и управления (декан Юрий Эдуардович Белых, зам. декана по физвоспитанию Тамара Ивановна Малышко). За III место награду получил физико-технический факультет (декан Геннадий Алексеевич Гачко, зам. декана по физвоспитанию Олег Иванович Смоляков). Четвертое место - математический факультет; пятое - факультет педагогики и психологии; шестое - биологический факультет; седьмое - факультет истории и культуры; восьмое - филологический факультет.

Заветный рубеж - звание Мастер спорта Республики Беларусь - впервые преодолели: Сергей Коротков - бокс, Виктор Мурыгин - велоспорт, Сергей Юрчак - греко-римская борьба, Андрей Каминский - вольная борьба, Павел Пелепягин - легкая атлетика, Владимир Рудевич - гребля. Им и были вручены удостоверения и знаки.

Подводя итоги спортивного года, ректор университета издал приказ о награждении и поощрении лучших спортсменов и тренеров-преподавателей, в котором отмечены более 80 человек.

На протяжении спортивного вечера свое мастерство в акробатике, художественной гимнастике, аэробике, атлетизме и в единоборствах демонстрировали студенты и учащиеся ДЮСШ.

**А. ЕМЕЛЬЯНЕНКО,**
**председатель спортклуба университета.**

# Астропрогноз на февраль

**ОВНЫ.** Для вас начало февраля обещает быть не очень приятным. Недостаток финансов вызовет недовольство собой, конфликты с домашними. К концу месяца обстановка стабилизируется.

**ТЕЛЬЦЫ.** Напряжение, нервозность последних январских дней будут еще какое-то время мешать вам. Следите за своим настроением, чтобы не испортить отношения с друзьями и близкими. Некоторым Тельцам гарантирован желанный подарок.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Работа и еще раз работа. Тонкая, ранимая натура Близнецов изнывает без положительных эмоций. Но в середине февраля звезды обещают хорошую, полноценную подзарядку. Ситуация улучшится. Будьте предельно внимательны: возможен удар ниже пояса в виде обмана, кражи, предательства тех, кто близок Вам.

**РАКИ.** Пора отдохнуть и перевести дух перед новыми свершениями. Именно так. То, что будет делать Рак, весомо, солидно, и обязательно принесет хороший результат в будущем. Поэтому не отвергайте любую возможность отдохнуть от дел. Впереди - большая работа.

**ЛЬВЫ.** До середины месяца не рекомендуется заключать сделки, покупать дорогие вещи. Звезды велят доделать начатое, возвратиться к нерешенным проблемам. Самое время привести в порядок дом и дела, до которых не доходили руки.

**ДЕВЫ.** Педантичная Дева все хочет расставить по своим местам. Но февраль - не лучший месяц для этого. Ваша тактика - выжидание. А большие дела и кардинальные перемены, точки над і - чуть позже.

**ВЕСЫ.** Желание действовать и самореализоваться настолько захлестнет некоторых представителей этого знака, что им будет не до чувств. А зря. Не пропустите шанс встретить свою мечту. Потому что Венера обещает Весам любовь.

**СКОРПИОНЫ.** Еще чуть-чуть - и Вы ухватите Жар-птицу за хвост. Удача рядом. Но Вам не хватает уверенности в себе, времени и желания. Прекратите плыть по воле волн, иначе засосет рутина, Вы можете пропустить свой звездный час в феврале.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Нездоровье, небольшие неприятности - вот такое начало месяца. Но все пройдет, и очень скоро. Вас ждет удача, особенно тех, кто решил отправиться в путь - даже в соседний магазин. Больше движения!

**КОЗЕРОГИ.** Безденежье. Весь месяц - недовольство собой и близкими. Хорошо тем, у кого есть настоящие друзья. Именно они помогут обрести силу и преодолеть кризис духа. И тогда... Фортуна повернется к Вам лицом.

**ВОДОЛЕИ.** Возможна встреча с неведомым: колдунами, магами. Будьте осторожны, общаясь с ними. Они способны принести в Вашу жизнь немало неприятностей, особенно если Ваши помыслы не очень чисты. Надейтесь больше на себя, и удача встретится на пути обязательно.

**РЫБЫ.** Излишняя напряженность в обстановке на работе. Недомолвки. Так можно загнать себя в угол. Смотрите на мир проще. Этот месяц - Ваш, несмотря на мелкие укусы мелких насекомых. Вы можете почувствовать уверенность в себе при определенных обстоятельствах.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ**
*Фотаілюстрацыя:* **Ул.САРОКІН**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО**

*Здадзена ў набор 15.01.99.*
*Падпісана да друку: 27.01.99. 15.00*
*Заказ № 6*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых іменаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.*